Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 4 (503) Вільня, Нядзеля 22 Студзеня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Шкодная конкурэнцыя.

Конкурэнцыя ў жыцьці людзкім — рэч цалком прыродная. Конкуруюць між сабой паасобныя людзкія адзінкі, таварыствы, арганізацыі, конкуруюць так-жа народы і дзяржавы. Усе яны між сабой конкуруюць, ідуць наўзавадкі, каб у здабываньні дабрабыту, культуры, волі і долі не астацца на якім чорным канцы, але заняць, у меру магчымасьці, пачэснае месца. Кожная такая конкурэнцыя, рэч нятолькі прыродная людзям, але так-жа й добрая, калі яна не адбываецца коштам тых вартасьцяў, якія ёсьць вартасьцямі для ўсіх конкурэнтаў, бо йнакш конкурэнцыя раўняецца ўзаемнаму іх самазьнішчэньню.

Гэткая шкодная, самабойчая конкурэнцыя апошнімі гадамі завялася ў Беларусаў. Завялі яе самалюбныя, пазбаўленыя як народна-палітычнага розуму, так і грамадзка-этычнага пачуцьця адзінкі.

Калі буйна разьвівалася „Грамада", адзінкі гэныя, узьбіўшыся на сам верх яе, п'янелі ўдачай, пяялі занадта галосныя гымны на чэсьць Саветаў,разьдзьмухавалі дзікую дэмагогію і, каб выслужыцца прад кім трэба, з усіх сіл нішчылі ўсё іншае беларускае жыцьцё, „Грамадой" не абнятае. Шкодная конкурэнцыя йшла поўнай парай.

Але вось выбіла гадзіна. Грамадаўскі карабель у 1927 г. загарэўся і пачаў тонуць. Гдзе-ж павадыры-капітаны? Яны, заняўшы бясьпечныя мяйсцы,далей конкуравалі. далей ішлі наўзавадкі, хто хутчэй карабель гэты зьнішчыць: яны адкрыта пачалі да агню падліваць — хто «польскай», а хто «савецкай» алівы. У выніку беларускаму народу гэтым была зроблена шкода сапраўды вялікая.

Але гэная конкурэнцыя, гэнае завадыяцтва за генэральскую, або й за „манаршую" славу гэных адзінак, завадыяцтвам палітычным ня скончылася, а перанеслася на беларускую ніву культурную, якую так-жа пачало засьмячаць і пустошыць.

Нешта ад 1918 г. існавала ў Вільні Цэнтральная Школьная Рада, як адзіная беларуская арганізацыя, якая мела сваім заданьнем закладаць беларускія школы, імі апякавацца, а так-жа й агулам рупіцца аб беларускай асьвеце. Урэшце Рада гэна ў 1926 г.ператварылася ў існуючае да сяньня „Таварыства Беларускай Школы". Таварыства гэта тады адразу захапілі ў свае рукі тыя-ж палітыканы-конкурэнты, што фактычна кіравалі „Грамадой",і якія з гэтай чыста культурнай, агульна-беларускай арганізацыі зрабілі так-жа палітычную грамадаўскую арэну. Беларускіх культурных дзеячоў, якія ў іх палітыку не запрагаліся, яны не дапускалі, а быўшых ужо ў Т-ве проста выключалі, як гэта было зроблена ў канцы 1926 г. з Кс. Ад. Станкевічам, які быў сталым сябрам і дзейным працаўніком сьпярша Школьнай Рады, — а ў 1924 г. нават яе Старшынёй,— а пасьля Т-ва Бел. Школы, якой зьяўляецца адным з закладчыкаў.

Конкурэнцыя гэта сваё зрабіла. На беларускай культурнай і асьветнай ніве паявіўся застой і замяшаньне.

Беларускім народнікам нічога не асталася іншага, як заснаваць нейкую новую беларускую культурную, з выключэньнем усякай палітыкі, арганізацыю і далей у меру сіл сваіх працаваць на культурнай ніве адраджэньня беларускага народа. Летам 1926 г. паўстаў „Бел. Інст. Гасп. і Культуры". Паўстаў ён не дзеля конкурэнцыі, але каб заняць пустое месца, — спустошанае гэнымі конкурэнтамі, фактычна кіруючымі тады Т-вам Бел. Школы, — на заглохшай беларускай культурна-асьветнай ніве. Да таго-ж і мэты Інстытуту, як гэта выглядае з яго назовы і статуту, ня толькі асьветна-культурныя, але так-жа, і то прадусім, гаспадарчыя.

Урэшце, дзякуючы натужнай працы конкурэнтаў, ад „Грамады" асталіся толькі асколкі. Былі гэта пераважна беларускія сялянскія інтэлігенты, бясчэсна пакінутыя „сваімі павадырамі", якія для конкурэнцыі і з гэтымі рэшткамі пачалі ўжо шукаць для сябе падтрыманьня ў польскіх „адпаведных" прадпрыемствах. Пакінутым пачалі адчыняцца вочы на ўсю тую ігру, якую „іх павадыры" для сваей асабістай амбіцыі і карысьці з імі згулялі. Гэныя грамадаўскія разьбіткі, як ідэйныя беларускія народнікі, затужылі да роднай школы, да роднай асьветы, да роднай культурнай арганізацыі. Многія з іх знашлі поле для культурнай працы ў Бел. Інстытуце Гасп. і Культуры, а многія, па старой прывычцы, дзеля тэй-жа працы пачалі ўзноў арганізавацца пад сьцягам Т-ва Бел. Школы, выкідаючы з яе ўсякую палітыку.

Але-ж ня спалі й конкурэнты. У жніўні 1930 г. паўстае ў Вільні „Цэнтральны Саюз Бел. Культурна-Прасьветных і Гаспадарчых арганізацыяў і інстытуцыяў", а фактычна „Цэнтральны Саюз" былых „павадыроў-конкурэнтаў" „Грамады", а цяпер ужо беларуска-польскіх санатараў, мэтай якіх: далейшая конкурэнцыя з усімі праявамі беларускага жыцьця. І сапраўды, „Цэнтральны Саюз" гэты „дастойна" конкураваў і з беларускай палітыкай (выбары) і з беларускай школай (Вуч. Сэмінарыя, Гімназія) і з беларускім арганізацыйным жыцьцём бел. студэнскай моладзі (Скарынія) і г. д.

Але вось прайшлі два гады і праўдзівае абліччэ „Цэнтрасаюзу" сусім сталася больш чым ясным, дык паўцякалі з яго ўсе. Асталіся дасло́ўна толькі „павадыры-конкурэнты".

Урэшце вышла так, што й „сам ні гам і другому ня дам". Што конкурэнцыйны „Цэнтрасаюз" збанкрутаваў — гэта цалком зразумела. Інакш і быць не магло. Але ён— гэты-ж „Цэнтрасаюз" спаралізаваў разьвіцьцё і працу Т-ва Бел. Школы, якое аж да сяньня не змагло адбыць Агульнага Сходу, дзякуючы існуючай конкурэнцыі „Цэнтрасаюзу".

А вось і фінал: Прэзыдыюм Т-ва Бел. Школы аддаены пад суд быццам за камуністычную працу, а санацыйныя конкурэнты тымчасам залажылі новую, быццам культурную арганізацыю, падшываючы яе, каб лягчэй ішла конкурэнцыя, пад назоў Т-ва Бел. Школы, бо называючы яе мала інакш: Т.Б.А. Тут ужо самы вяршок больш чым шкоднай конкурэнцыі!

Так, „нашы" санатары, ці вярней „biełorusini-połacy" дужа нездаровую і шкодную вядуць конкурэнцыю ў беларускім народным руху.

Так-жасама нездаровую і дужа шкодную конкурэнцыю вядуць у беларускім культурна-асьветным руху некаторыя безадказныя адзінкі быццам ад імя Т-ва Бел. Школы, якія (маем на гэта факты) агітуюць сялян пакідаць ужо заложаныя і дужо існуючыя ідобра працуючыя гурткі Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры і закладаць на іх месца гурткі Т-ва Бел. Школы. А як „лёгка" заснаваць новы гурток ці Т-ва Школы ці Інстытуту, мы гэта добра ведаем! Ясна такім чынам, што гэткая конкурэнцыя — гэта яўная, магчыма нясьведамая, правакацыя, якая вядзе да зьнішчэньня асяродкаў беларускай культуры і асьветы. Магчыма, што з падобнай конкурэнцыяй аднесна Т-ва Бел.Школы выступаюць нейдзе так-жа безадказныя адзінкі і з Бел. Інстытуту Гасп. і Культ., што, калі-б здарылася сапраўды, так-жа было-б нездаровай і шкоднай конкурэнцыяй.

Дык проч з усякай дзікой конкурэнцыяй!

Яшчэ аб прычынах галіты нашай вёскі і аб новых для яе «падарках».

У «Б. Крыніцы» за апошні год мы разглядалі прычыны галіты нашай вёскі, галоўным чынам выплываючыя з ваенных падзеяў. Прыгледзімся цяпер да прычын паваенных і ў першую чаргу да здабыткаў, што нармуюць жыцьцё нашае вёскі. Адразу трэба тут падчыркнуць, што гэтыя здабыткі дасталіся нашай вёсцы без яе веды і згоды.

Першым гэтакім здабыткам ёсьць праўнае зраўнаньне мужчын і жанчын у справах спадковых. Здавалася, на першы пагляд, што гэта быў шаг уперад і вёска павінна быць з гэтага задаволена. На практыцы аднак паказалася наадварот. Пасьля ўвядзеньня яго ў жыцьцё, распачала вясковая зямелька, дагэтуль і так парэзаная, драбіцца яшчэ на меншыя кусочкі, а прытым не абходзіцца і бяз судоў: няма бадай радні, каб гдзе жанчына, даўно замужняя, у дабавак выпасажаная, не распачала аб зямлю судовай справы, якая, нярэдка, цягнецца цэлымі гадамі, прыводзячы і адну і другую старану проста да торбы.

Заграніцай, напрыклад у Норвэгіі і інш. краёх, спадак па бацьках атрымлівае старшы сын, а малодшым ён за іх часьці сплачывае. Зямлі там ад пэўнай нормы дзяліць ужо ня можна. Тыя, што атрымалі сплату, бяруцца да гандлю, промыслу і такім чынам паўстае і свойскі гандаль і промысел. У нас — нічога падобнага: адно і другое апынулася ў руках бадай выключна чужынцаў.

Другая «дабрадзейнасьць», каторай абдарылі нашу вёску пасьля вайны — гэта прымусовая страхоўка будынкаў. Кожны селянін ведае добра, як гэта робіцца і колькі ён мае з гэтага права карысьці. Дабрадзейнасьць гэта зводзіцца да таго, што страхавое таварыства, карыстаючыся з праўна-дзяржаўнага прывілею, селяніну кажа: „плаці мне страхоўкі колькі я табе назначу, а калі твае будынкі згараць, то я табе заплачу, колькі... ацэнка пакажа."

Маем яшчэ адзін здабытак, што даўся ў знакі гарадом, а цяпер думаюць абдарыць гэтай дабрадзейнай установай і нашу вёску.

Гэта ўстанова называецца «Каса Хворых». Доўга работнікі дамагаліся, каб фабрыканты лячылі іх на свой кошт. Фабрыканты сталі ўтрымліваць пры фабрыках дахтароў. Не падабалася гэта аднак работнікам, яны сталі дамагацца, каб фабрыканты за лячэньне работнікаў плацілі, а лекары і лякарні былі самі па сабе, незалежныя. Так і сталася: кожнае цяпер прадпрыемства за сваіх работнікаў плаціць у «Касу Хворых», а ў выпадку хваробы яна лечыць іх работнікаў дарма.

Праект гэты, на паперы надта прыгожы у практыцы аказаўся ня зусім карысны: хоць фабрыканты ў „Касу Хворых" за работнікаў і плацяць, вылічаюць ім аднак і з іхняй заработнай платы. »Касы Хворых«, зьбіраючы вялізарныя сумы (больш ёсьць здаровых, чымся хворых),лечаць работнікаў, гэта праўда, але хутчэй можна папасьці «да Абрагама

24109

на піва», чым у „Касе Хворых” да дохтара:

Каб мець права да ягоных агледзінаў, дык трэба дастаць перш пропуск з канцэлярыі.

Лекарскіх пунктаў, з прычыны ашчаднасьці, надта мала, хворых зьбіраецца штодзень вельмі многа, трэба стаяць цэлымі днямі ў калейцы і прад канцэлярыяй і прад кабінэтам дохтара, і калі ты яшчэ не памёр, дык дохтар на цябе зірне і ідзі, бо-ж там чакаюць яшчэ сотні.

Гэтакай вось дабрадзейнасьцяй хочуць абдарыць і нашу вёску.

„Як-жа гэта?—спытае здзіўлены селянін. Мы ані прадпрыемстваў, ані фабрыкаў ня маем, не наймаем і работнікаў, дык за каго маем плаціць“?

А вось як: кожны гаспадар, што хоць малую мае гаспадарку — гэта ягонае прадпрыемства, а дзеці ягоныя яму працуюць, і прытым дарма — гэта ягоныя работнікі, дык за іх і думаюць завесьці плату: чым больш дзяцей, тым больш работнікаў, тым больш платы. Тады, як захварэе хто, дык дастане да дохтара пропуск, а з гэтым пропускам можа далей ісьці да дохтара. Дык вось чым думаюць яшчэ „абдарыць“ і нашае сялянства.

Смык.

З ГАЗЭТ.

„Трэба перамены“.

Пад гэткім загалоўкам ксяндзоўскі польскі «Nasz Przyjaciel» у нумары 3 за 1933 г. зьмяшчае стацьцю, у якой даказвае, што „трэба ўжо перамены“ і цьвердзіць, што „далей гэтак быць ня можа“.

Гэнага пракананьня набраўся аўтор гэтага артыкулу толькі тады, калі пагаварыў з беларускім селянінам у Вялейскім павеце і з сялянамі каля літоўска-польскай адміністрацыйнай граніцы.

Беларускі сялянін у Вялейскім павеце, на запытаньне аўтора артыкулу „Трэба перамены“, як жывецца людзям на сяле?—адказаў быццам так: „ня вельмі... але дасьць Бог выдзяржым і перажывём; пражылі Немцаў, бальшавікоў, Літвіноў (тут, дык рэдактар „N. P.“ перабаршчыў, бо ў Вялейскім павеце Літоўцы ня былі — рэд.) дык і „непадлегласьць“ перажывём“.

Аб гэткіх настроях сярод беларусаў эндэцкі публіцыст даведаўся толькі цяпер, а яны такія ўжо даўно.

Сяляне з-пад літоўска-польскай адм. граніцы заявілі прадстаўніку польскай эндэцыі дасłоўна так: „каб цяпер зрабілі галасаваньне, дык мы ўжо не памыліліся-б“.

З беларускага жыцьця.

Лекцыя ў Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы. У нядзелю 22 г. м. а 5 гадзіне ўвечары, ў VII залі Унівэрсытэту ў Вільні адбудзецца IV навуковая зборка Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы з лекцыяй грам. Ст. Станкевіча на тэму «Інстытут Беларускае Культуры — Беларуская Акадэмія Навук у Менску.»

З выдавецкае нівы. Гэтымі днямі выйшлі: «Шлях Моладзі“ № 12, за м-ц сьнежань 1932 г., часопісь беларускай моладзі, і „Chryścijanskaja Dumka» Nr 1 — 1933 г. беларуская каталіцкая часопісь. — Вышла таксама з друку брашура „Камсамол і ягоныя мэты“— С. Баркоўскі, Вільня 1933 г., агітацыйная брашура процiў камунізму. Выдавецтва нявідамае.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

„Беларуская Школа ў Латвіі“ № 7 Рыга, сьнежань 1932 г. падае:

Дня 30 сьнежня 1932 г. Рыжская прыватная беларуская гімназія „Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі“ ладзіла сьвяткаваньне 50-ых угодкаў Уладыслава Галубка і 80-ых угодкаў Беларускага Тэатру. Рэфэрат прачытаў грам. К. Езавітаў на тэму „Беларускі Тэатр і Уладыслаў Галубок.“

Беларускае Навукова-Краязнаўчае Т-ва прыступіла да друку намечаных на 1933 год выданьняў. Надрукаваны ўжо статут Т-ва, а ў друку знаходзяцца: „Ахова помнікаў старажытнасьці на Віцебшчыне» — Б. Брэжго і „Продкі беларусаў і славянства“— М. Вяршыніна.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛІТВЕ.

Беларускае Культурна-Прасьветнае Т-ва ў Літве для сваіх сяброў места Коўні наладзіла ў сваім клюбе „Беларуская Хатка“ сяброўскі вечар спатканьня Новага Году. На гэтым вечары адыграна была камэдыя „Міхалка.“ Апрача гэтага прачытаны рэфэрат аб Дунін-Марцінкевічу ў юбілей 125 гадаўшчыны яго нараджэньня, а так-жа рэфарат аб Ул. Галубку ў 50-ыя ўгодкі яго жыцьця. Вечар гэны ажыўлялі беларускія народныя песьні, танцы і дэклямацыі вершаў беларускіх паэтаў.

На наш пагляд, не паможа тут палітычнае лякарства ані эндэцкае, ані санацыйнае, бо народ нашага краю здаровы і жывець сваім па прыроднаму праву жыцьцём, з верай і надзеяй у лепшае заўтра, пераглядаючы свае памылкі і намячаючы шлях на будучыню.

п.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Масавыя арышты. Менская „Зьвязда“ зьмяшчае рэвэляцыйную стацьцю старшыні Бел. Акадэміі Навук Горына, які падае, што ў Мозыры арыштавана група асоб з манархістычных, кадэцкіх, эсэраўскіх і беларускіх соц.-дэмократычных кругоў, якія праводзілі агітацыю(?). Павадыром гэтай групы быў селянін Кунгар. Арыштаваны сябра гэтай групы Невядомскі выявіў, што кліч барацьбы з колектывізацыяй быў толькі тактычным манэўрам, пры помачы якога загаворшчыкі хацелі вытварыць настрой дагодны да аружнай барацьбы з бальшавікамі. Адначасна, паводле рэвэляцыі Горына, бальшавіцкія ўлады у Менску выкрылі контррэвалюцыйную арганізацыю сярод служачых „Белгасземтрэсту.“ Сябры гэтай арганізацыі гэта беларускія нацыянал-дэмократы. Старшынёй гэтай арганізацыі быў бышы афіцэр Пажарскі. Ён прызнаўся, што мэтай арганізацыі была абарона сялян (кулакоў) ад зьдзекаў бальшавікоў.

Гэтулькі піша прававерны камуніст Горын. Сапраўднасьць, думаем, схавана бальшавікамі глыбока.

Суд над 23. Менскі вярхоўны суд БССР. судзіць цяпер 23 асобы за „рабунак“ г. зв. „дэфіцытных тавараў“. На чале падсудных ёсьць заступнік дырэктара „Белгаскаба“ Таўкач, бышы сэкрэтар беларускага сэпаратыстычнага камітэту ў Адэсе ў 1918 г. Ад 1924 году Таўкач быў выдатным савецкім бюракратам у Менску.

З жыцьця Літоўцаў.

Літоўская заграмічная палітыка за 1932 г.— Кангрэс Вільнян. — Студэнты Літоўскага Ўнівэрсытэту.

„Lietuvos Aidas“ зьмясьціла артыкул аб літоўскай заграмічнай палітыцы за мінулы год. „Kur. Wil.“ (№№ 6 і 8) артыкул гэны выкарыстаў і пазнаёміў з ім сваіх чытачоў. Вось-жа паводле „Kur. Wil.“ „Liet. Aidas“ аб успомненай палітыцы між іншым так піша:

— „...Стараючыся ўтрымаць добрыя адносіны з сваімі суседзямі, Літва ня можа забыцца народнай справы. Злучэньне зямель, заселеных літоўскім народам, пад адным сьцягам было і будзе прынцыповым заданьнем літоўскай заграмічнай палітыкі.

У 1932 г. Літва мела вялікую ўдачу. Першай такой удачай быў выйгрыш у справе Клайпэды ў Гаскім Трыбунале.

Апрача гэтага Літва падпісала гандлёвыя дагаворы з цэлым радам дзяржаў. Дагаворы

Беларускі выдавецкі рух у Вільні ў 1932 г.

A. W.: Betlejka. Sceničny abrazok u wadnym akcie. Wyd. „Chryścijanskaj Dumki“. Wilnia. 1932 h. Bačynaŭ 16.

A. W.: Kaniok-Harbuniok, wieršawanaja bajka pawodle Jeršowa. Wyd. „Biel. Krynicy“. Wilnia 1932 h. Bačynaŭ 88.

A. B. Унія на Палесьсі. Вершаваная дыскусія уніята, праваслаўнага манаха і р.-к. ксяндза. Выд. Ісусавага Таварыства. Альбэртын 1932 г. Бачынаў 16.

Alchoŭski Iw.: Jak żywiecca sialanstwu pad kamunistyčnaj uładaj? Prapahacyjnaja ŭlotka. Drukawana ŭ W. Znamiaroŭskaha. Wilnia 1932 h. Bačynaŭ 16.

Беларус Б.: Што такое Унія? Прапагацыйная ўлётка. Выд. на правох рукапісу Гіцэвіч. Вільня 1932 г. Бачынаў 4.

Беларускі Календар на 1933 год. Кніжка абымае перадусім вельмі цэнны матэрыял да пазнаньня гісторыі і сучаснага палажэньня рэлігійнай справы на Беларусі, а таксама аддзел інформацыйны. Выд. Я. Малецкага. Вільня, 1932 г.. Бачынаў 100.

Беларускі Народны Календар на 1933 г. Кніжка-інформатар. Друкаваная ў У. Знамяроўскага. Вільня 1932 г. Бачынаў 62.

Božaja Chwała, malitaŭnik Zakońnikaŭ Ajcoŭ Maryjanaŭ, pałacinsku i pabiełarusku. Wydany na prawoch rukapisu. Druja 1932 h. Bačynaŭ 83.

Бусел С., інж.-агр.: Матыльковыя расьліны. Перагляд і застасаваньне важнейшых матыльковых расьлін спатыканых на Беларусі. Выд. „Цэнтрасаюзу“. Вільня 1932 г. Бачынаў 62.

Голуб-Бучынская М., д-р мэд.: Што такое сухоты (тубэркулёза) і як з імі змагацца? — Популярнае апісаньне сухотных формаў і спосабаў абароны ад іх. — Выд. аўтора. Вільня, 1932 г. Бачынаў 14.

Ільяшэвіч Хведар: Зорным шляхам. Зборнік вершаў. Выд. Бел. Выдавецкага Т-ва ў Вільні. Вільня 1932 г. Бачынаў 64

Kazłoŭščyk Uładysłaŭ: Puty kachańnia. Wieršawany ramans. Wyd. U. Znamiaroŭskaha. Wilnia 1932 h. Bačynaŭ 94.

Клімовіч Ад.: І культура і палітыка. — Рэфэрат прачытаны на Зьезьдзе Б. Х. Д. 13.XII.1931 г. Выд. „Бел. Крыніцы“. Вільня 1932 г. Бачынаў 16.

Klimovič Ad. inž.: Leki na ździeki. Popularny narys kooperatyŭnaj samapomačy. Vyd. Vil. Addziełu Biel. Instytutu Hasp. i Kultury. Vilnia 1932 h. Bačynaŭ 32.

Klimovič Ad. inž.: Ziemlarobskaja čytanka. 1-ja častka. Zbornik staćciej ab haspadarcy polnaj, damovaj, žyviołahadaŭlanaj, ab małačarstvie, pčalarstvie, rybactvie, laśnictvie, kooperacyi, ab fachovaj aśviecie i ziamielnaj palitycy. Materyjał sastaŭleny pavodle poraŭ hodu i moža służyć jak daradčyk pieradusim drobnaha haspadara-ziemlaroba. — Vydańnie „Bieł. Krynicy“. Vilnia 1932 h. Bačynaŭ 144.

Pačorka B świašč.: Jak wučyć nas wieryć i žyć świataja Chrystowaja paŭsiudnaja Cerkwa? Wyd. aŭtora. Wilnia 1932 h. Bačynaŭ 15.

Праграма і Статут Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі (Б.Х.Д.). Зацьверджаная на Зьезьдзе дн. 13.XII.31. Выд. Ц.К.-Б.Х.Д. Вільня 1932 г. Бачынаў 16.

Русаковіч А.: Ад волі — да прымусу. Прапагацыйная антысавецкая брашура. Выд. «Цэнтрасаюзу». Вільня 1932 г. Бачынаў 28.

Русаковіч А.: У краіне прымусу. Прапагацыйная брашура, дапаўненьне папярэдняй. Выд. «Цэнтрасаюзу». Вільня 1932 г. Бачынаў 30.

Swajak Kazimier: Dzieja majej myśli, serca i woli. Aŭtobiografičnyja zapiski wiedzienyja ad dziacinstwa da 1925 h. ŭklučna. Wyjaŭłajecca ŭ ich jasna postać pradčasna (na 36 h. życcia) pamioršaha ad suchotaŭ aŭtora. wiedamaha biełaruskaha paeta, filozafa i dziejača. Wydańnie „Chryścijanskaj Dumki“. Wilnia 1932 h. Bačynaŭ 70.

У Латвіі вышлі з друку:

Аляхновіч Ф.: У лясным гушчары. Казка ў адным акце для дзяцей малодшага веку. Выданьне Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. Рыга 1932 г. Бачынаў 14.

Езавітаў К.: Беларускае культурна-асьветнае Т-ва Бацькаўшчына ў Латгаліі. — Юбілейны нарыс дзейнасьці Т-ва ў справе арганізацыі беларускіх школ у Латвіі. Выд. Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. Рыга 1932 г. Бачынаў 24.

Езавітаў К.: Беларусы ў Літве. Перагляд праўна-палітычнага і культурна-грамадзкага палажэньня беларускай меншасьці ў Літве. Выд. Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. Рыга 1932 г. Бачынаў 16.

гэтыя далі нямала карысьці. Падпісаны яны з наступнымі дзяржавамі: з Францыяй, Фінляндыяй, Португаліяй, Бразыліяй, Англіяй, Чэхаславакіяй і з іншымі дзяржавамі.

Але ёсьць і недахоп у галіне літоўскай загранічнай палітыкі. Літва не атрымала забранага Палякамі краю. Аднак ня трэба забывацца, што змаганьне за Вільню будзе доўгае і ўпорыстае...

Між Літоўцамі і Палякамі ляжыць пропасьць. Паўстала яна дзеля таго, што Палякі забралі Вільню і прасьледуюць Літоўцаў. Дык дзівіцца трэба, што ў такіх варунках Палякі Літоўцаў называюць „братамі“ і паўтараюць: „роўныя з роўнымі і вольныя з вольнымі“.

Прадваенная польская паэзія здабыла Палякам сымпатыю ў іншых народаў. Аказалася аднак, што паэзія гэна была толькі параванам, за якім укрываўся ўціск народных меншасьцяў“...

— „Kur. Wil.“ падае так-жа, што 5 і 6 студзеня сёл. г. у Коўне адбыўся Кангрэс Вільнян, лікам 408 асоб. На Кангрэсе было прачытана некалькі рэфэратаў аб палажэньні Літоўцаў у Віленшчыне. Прамоўцы асабліва падчырківалі цяжкае палажэньне ў гэтым краі літоўскай школы.

Адзін з прамоўцаў, праф. Жэмайтіс запрапанаваў, каб віленская справа была вылучана з партыйных спораў і каб сталася дзеля гэтага цэмэнтам, які лучыў-бы ўсіх Літоўцаў.

Кангрэс віталі Беларусы, Украінцы і бадай усе літоўскія арганізацыі.

Кангрэс між іншымі прыняў наступныя пастановы: паслаць насельніцтву Віленшчыны, бяз розьніцы народнасьці, словы спагады; апісаць заграніцай, як і калі Палякі занялі Вільню, зьвярнуцца да сьв. Айца з просьбай, каб устрымаў полёнізатараў, якія топчаць правы каталікоў Літоўцаў і Беларусаў...

— Усіх студэнтаў у Літоўскім унівэрсытэце ў Коўне налічваецца 4,554. На тэолёгіі і філёзофіі — 298, на гуманістыцы — 615, на праве — 1,609, на матэматыцы і прыродзе — 354, на мэдыцыне — 952, на тэхніцы — 704.

Студэнтаў Літоўцаў — 3,056, Жыдоў — 1,209, Палякоў — 117, Расейцаў — 64, Немцаў — 67. Латышоў — 14, Беларусаў — 13, Татараў — 1, Караімаў — 1, Швэдаў — 1, Арабаў — 1.

Дарэчы будзе ўрэшце адцеміць, што сярод гэных студэнтаў 112 асоб паходзяць з Віленшчыны.

М. К.

З Польшчы.

З Сойму. У соймавай камісіі нядаўна разглядаўся бюджэт міністэрства справядлівасьці. У дыскусіі сяброў гэтай камісіі пасол з П.П.С. Недзялкоўскі выступіў з крытыкай польскіх судоў. Ён сьцьвердзіў нязвычайную лічбу, бо **197 выкананых прысудаў сьмерці** па пастанове наглых (даразных) судоў. Пры гэтым пас. Недзялкоўскі заявіў, што памілаваньняў Прэзыдэнтам было мала. Паводле слоў пасла Недзялкоўскага, вінаваты ў гэтым дарадчыкі Прэзыдэнта.

Пераходзячы да прысуду сьмерці ў Львове (маладых украінцаў Данілышына і Біласа) пас. Недзялкоўскі пацьвердзіў, што „напад у Гарадку меў палітычны характар і дзеля гэтага называньне яго спраўцаў у бруковай санацыйнай прэсе „зладзеямі“ і „бандытамі“ было для іх крыўдай, а прысуд сьмерці выкананы не на крымінальных, але палітычных праступніках. Дзеля гэтага прамоўца дагледжваецца віны дарадчыкаў Прэзыдэнта і сьцьвярджае, што гэта адаб'ецца ў будучыні на польска-ўкраінскіх суадносінах.

Пасьпех з самаўрадам. У адміністрацыйнай соймавай камісіі пасьпешна разглядаецца новы закон для самаўрадаў. Паседжаньні адбываюцца рана і па паўдні. Да свайго законапраекту клюб Б.Б. падаў цэлы рад папраўак, некаторыя — засаднічай натуры.

Бэ-Бэкі цьвердзяць, што самаўрадавы закон будзе гатоў у гэтай бюджэтнай сэсіі сойму, а ў жыцьцё ўвойдзе ў м-цы чэрвені с. г. Выбары ў самаўрады, паводле гэтага закону, маюць адбыцца ўвосень 1933 году.

Газэты падаюць, што ўрад гатовіць праект, каб час урадаваньня цяперашняга самаўраду прадоўжыць да часу новых выбараў паводле новага для самаўрадаў закону.

Пашырэньне наглых (даразных) судоў. Апошнімі часамі некаторыя генэралы—камандзеры О. К. завялі ў сваіх вокругах ваенныя наглыя (даразныя) суды. Гэтак заведзены ваенныя наглыя суды ў вокругах Лодзкім і Варшаўскім.

За даўгі — ў вастрог. Мін. Справядлівасьці выдаў распараджэньне ў справе саджэньня ў вастрог судовымі каморнікамі даўжнікоў.

Судовы каморнік можа пасадзіць ў вастрог даўжніка, калі верыцель паложыць на гэта ў дэпозыт адпаведную суму грошай на пакрыцьцё коштаў прабываньня і пракармленьня арыштованага. („Piast“ № 3—1933).

Мала хіба знойдзецца такіх, што захоча даплачываць, каб яго даўжнік пасядзеў у вастрозе. Хіба захоча памсьціцца.

Масавыя рэдукцыі фізычных і ўмысловых работнікаў. З канцом 1932 году наступіла новая рэдукцыя (звальненьне ад работы) ў многіх прадпрыемствах, як дзяржаўных так і прыватных работнікаў фізычных і ўмысловых. Працаўнікі банкаў, фабрык, магістратаў асталі „вымувене“ — адмову працы. Сярод іх паўстала зразумелая паніка. Прыватныя фірмы заявілі, што мусяць ліквідаваць свае прадпрыемствы, бо няма найменшай надзеі на якую-небудзь паправу палажэньня.

Прамысловыя патэнты на 1933 год ня ўсе выкупілі. Прад Новым годам скарбовыя ўлады прыпаміналі, каб прамысловыя патэнты на 1933 год былі выкуплены да канца сьнежня, бо ў праціўным выпадку на „спазьніўшыхся“ будуць кары. Не зважаючы на гэта аказалася, што ў студзені астаецца яшчэ 40 проц. гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў, якія ня выкупілі патэнтаў на 1933 г. Відаць, не маглі, дык і страх прад карай нічога не памог.

Эканамічныя весткі.

Кончыўся крызыс — пачалася дэпрэсія. У Польшчы гавораць вясёлыя людзі, што крызыс ужо кончыўся, але пачалася дэпрэсія (спадак). Нешта падобнае сказаў і адзін нямецкі вучоны эканаміст. Але гэты апошні разумее слова „дэпрэсія“ ў іншым значэньні, як спадчыну па крызысе, а ня спадак. Ён даказвае, што ў Нямеччыне відаць ужо праявы ажыўленьня эканамічнага жыцьця. Дэпрэсія гэта пройдзе скора, а пасьля настане агульнае палепшаньне.

Ці гэтак будзе — паверыць трудна, бо гэткіх прадбачаньняў было ўжо шмат.

Вялікі плян для земляробства. У Амэрыцы парлямэнтарная камісія Зл. Шт. апрацавала вялікі плян для земляробства, дзеля падняцьця цэнаў земляробскай прадукцыі. Мае быць створаны вялізарны капітал, каля мільёна даляраў, за палавіну якога мае быць скуплівана земляробская прадукцыя па цэнах нармальных, а другую палавіну капіталу прызначаецца на падтрыманьне гадоўлі жывёлы. Каб не гразіла далей зьніжка цэнаў на збожжа і жывёлу, камісія гэта прапануе завясьці прымусовае зьмяншэньне гадоўлі жывёлы і засеваў збожжа на 20 проц.

Прыймо падпіскі на «Бел. Крыніцу», з правам дастаць прэмію, прадаўжаецца йтчэ на месяц, г. зн. да 25-га лютага с. г.

Ф. Сахарава: Птушка на волі. П'еса ў 3-х дзеях са сьпевамі з жыцьця беларускай вёскі. Выд. аўтора. Дзьвінск 1932 г. Бачынаў 34.

Статут Беларускага Навукова-Краязнаўчага Таварыства ў Латвіі. Выданьне ўласнае. Рыга 1932 г. Бачынаў 16.

Беларуская пэрыодычная прэса ў Зах. Беларусі за 1932 г.

Беларуская Крыніца — палітычная, грамадзкая і літэратурная газэта. Тыднёвік, друкуецца наперамену: раз гражданкай, раз лацінкай. XVI год выданьня — найстаршая з усіх сучасных беларускіх газэт. Рэдактар — Я. Пазьняк. Падпіска на год 4 зл., заграніцу — ўдвая даражэй. Адрэс: Вільня (Wilno), Людвісарская 1—19.

Studenskaja Trybuna — miesiačny dadatak da „Biel. Krynicy“. Vyjšla dva numary. Redakcyjnaja kalehija ŭraduje što-niadzielu — aprača ferыjaŭ — u pamieškańni redakcyi „Biel. Krynicy“: Vilnia, Ludvisarskaja 1—19 ad 11 da 12-aj hadz. ŭdzień.

Chryścijanskaja Dumka — bielaruskaja katalickaja časopiś (miesiačnik). V-ty hod vydańnia. Redaktar — Ks. Adam Stankiewič. Padpiska na hod 4 zł., zahranicu — ŭdwaja daražej. Adres: Wilnia, w. św. Mikałaja 8—3.

Царква і Народ — беларуская праваслаўная часопісь. Выйшаў № 1-шы. Адрэс рэдакцыі: Вільня, Баровая вул. 7а—1.

Да Злучэньня! — Беларуская рэлігійная часопісь, (уніяцкая). Месячнік. Рэдактар — а. А. Неманцэвіч. Падпісная плата на год зл. 3.50. Адрэс рэдакцыі: Альбэртын к/Слоніма, Кляштар.

Самапомач — беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопісь. Друкуецца адначасна гражданкай і лацінкай. Месячнік; пачаў выходзіць у м-цы кастрычніку 1932 г. Рэдактар — інж. Ад. Клімовіч. Падпіска на год 3 зл., на паўгоду — 1.75 зл. і на 3 мес.— 1 зл. Заграніцу — ўдвая даражэй. Адрэс: Вільня, Полацкая 4—10. Грошы перасылаць на чэкавае конто ў П.К.О. (Р.К.О.) інж. Клімовіча № 180.485.

Шлях Моладзі — часопісь беларускай моладзі. Месячнік; друкуецца гражданкай і лацінкай адначасна. Год выданьня IV-ты. Рэдактар — Яз. Найдзюк. Падпісная плата на год 2 зл., заграніцу—ўдвая даражэй. Адрэс: Вільня, Завальная вул. 6—10.

Нёман—літэратурна-навуковы месячнік. Выйшла 5 сшыткоў. Рэдактар — Ст. Станкевіч. Падпіска на год 6 зл. Адрэс: Вільня, Партовая 28—10.

Бюлетэнь Т. Б. Ш. — як аднаднёўка выйшаў 3 разы за год: 6-VII, 28-IX і 30-XI-32 г. Зьместам бюлетэню ёсьць інфармацыі аб дзейнасьці Т.Б.Ш. Рэдактар — Ф. Стэцкевіч. Адрэс: Вільня, Кіеўская 4—24.

Пралескі — Вучнёўская часопісь Віленскай Беларускай гімназіі. Выйшаў адзін толькі нумар за м-ц чэрвень 1932 г., рэдагаваны рэдакцыйнай калегіяй пад наглядам настаўніка В. Грышкевіча; адбіваны на шапірографе. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 9. Гімназія.

Студэнскі Кліч — часопісь-аднаднёўка. На правох рукапісу. Ліпень 1932 г. Рэдактар— Я. Касяк.

Шлях — часопісь не пасьпеўшая паказаць грамадзянству свайго аблічча, бо на 3-цім ужо нумары фактычна прыпыненая. Рэдактар — К. Чартовіч.

Беларускі Звон — орган полёнафільскай групы Р. Астроўскага і А. Луцкевіча. Ў м-цы сьнежні перастаў выходзіць.

Novaja Varta — časopiś studenskaj korporacyi „Scorinia“. Vyjšaŭ adzin tolki numar (2-hi) datavany ŭ m-cy krasaviku 1932 h. Redaktar — K. Hlinski.

Сьветач Беларусі — Орган Бел. Цэнтр. Праваслаўнага К-ту. Выйшаў адзін толькі нумар. Рэдактар — Я. Бурак.

Голас Праваслаўнага Беларуса — Выйшаў адзін толькі нумар (3-ці).

Наш Голас — аднаднёўка, з датай «май 1932 г.» Рэдактар-выдавец — Ф. Акінчыц.

Беларуская Думка — орган „Б.Б.“, перастала ўжо выходзіць. Выходзіла ў Горадні.

У Латвіі (у Рызе) аднаўлена выдавецтва месячніка п. н.

Беларуская Школа ў Латвіі — папулярна-навуковы, пэдагогічны і літэратурна-грамадзкі штомесячнік. За 1932 г. выйшла 7 нумароў. Рэдактар — К. Езавітаў. Адрэс: Riga, Elija iela 20, dz. 25., або Riga, Pastkaste № 1362. Падпісная плата ў год 6 латаў.

Агулам у 1932-ім годзе ў Зах. Беларусі (і Латвіі) выйшла з друку 25 беларускіх кніжак і 19 такіх-жа пэрыодычных часопісяў (у тым ліку 2 аднаднёўкі).

Ах.

З заграніцы.

Безрабоцьце затрывожыла ўрэшце і Эўропу. У Жэнэве (Швайцарыя) пачалася міжнародная конфэрэнцыя працы, заданьнем якой ёсьць шукаць выхаду з катастрофы безрабоцьця. Адным з галоўных праектаў дзеля аблягчэньня цяжару безрабоцьця ёсьць законнае правядзеньне ва ўсіх дзяржавах 5—6 гадзіннага дня працы, замест дасюлешняга дня 8-гадзіннага.

Заданьне гэтай конфэрэнцыі ня лёгкае. Ва ўсім сьвеце ёсьць цяпер звыш 50 мільёнаў безработных, а калі далічыць іх сем'і, дык армія галодных з прычыны безрабоцьця вялізарная — каля 200 мільёнаў асоб. Дзяржаўныя запамогі ўжо безработных не забесьпячаюць ад голаду. Апошнімі часамі Ліга Народаў апрацавала вялізарны плян дзеля забесьпячэньня безработных працай у розных дзяржавах. Плян ужо ёсьць, але няма грошай, каб правесьці яго ў жыцьцё, трэба шукаць іншых плянаў. Найбольш простым здаецца зьмяншэньне продукцыі.

За апошнія 15 гадоў сіла машыны ўзрасла ў Эўропе з 94 мільёнаў на 135 мільёнаў конскіх сіл, а ў Амэрцы — з 96 мільён. на 162 мільёны. Гаводле амэрыканскіх абліченьняў, у трох амэрыканскіх прамысловых галінах (сталёвыя гуты, капальні вугля і фабрыкі абутку)працавала ў 1929 годзе 1.240.000 работнікаў. Цяпер гэтую работу робяць толькі 546 тысяч работнікаў. Калі разьвіцьцё тэхнікі будзе йсьці ўперад у такой скорасьці, як дагэтуль, дык за 25 гадоў, для выкананьня той самай работы трэба будзе замест 70 работнікаў, толькі 45.

Міжнародная арганізацыя працы спадзяецца, што праз скарочаньне дня працы можна будзе ўстрымаць разгон прадукцыі. Магчыма. Але трэба спадзявацца, што тады прамысловая прадукцыя яшчэ падаражэе.

Агулам кажучы — безрабоцьце сталася зачараваным колам, з якога ня вылезуць і ў Жэнэве.

Найбольш рэальным плянам выглядае нагляд амэрыканскі: — спыніць збраеньне, а грошы пусьціць на грамадзкія работы, заморскую колёнізацыю і стварэньне новых колёнізацыйных абшараў. Апрача гэтага — зьменшыць падаткі: гэта выкліча ў насельніцтве большую сілу ў куплі. Але ці на гэта Эўропа згодзіцца — трэба сумнівацца: яна занадта захоплена падгатоўкай да новай вайны.

Пры гэтым трэба адзначыць, што ад учасьця ў жэнэўскай конфэрэнцыі адмовіліся: Амэрыка і СССР. Амэрыка—мусіць таму, што ня верыць у разьвязку гэтай праблемы, пакуль Эўропа занята збраеньнем, а бальшавікі хіба таму, што ім на руку, каб безрабоцьце бурыла сьвет.

3.160 вагонаў золата вінавата Амэрыцы Эўропа. Галоўнымі даўжнікамі Амэрыкі спасярод эўрапэйскіх дзяржаў зьяўляюцца: Англія, Францыя, Бэльгія і Італія. Яны разам вінаваты Амэрыцы прыблізна 31.6 мільёнаў кіляграмаў золата. Калі-б гэнае золата зложыць у вагоны (вагон вязе 10.000 кіл.), дык вагоны з золатам саставілі-б цягнік даўжынёй на 16 кілёмэтраў.

Справа незаплачаных Амэрыцы даўгоў яшчэ ўсё вісіць у паветры. Амэрыка не сказала йшчэ, як будзе зысківаць гэтыя даўгі. А можа даруе... бо Эўропа і бяз гэтага мае вялікія выдаткі, асабліва на збраеньне.

Нямеччына йдзе цьвёрда да вызначанай мэты. У галіне заграрічнай палітыкі Нямеччына ўсё мацней дамагаецца рэвізіі Вэрсальскага трактату, а ў першую чаргу — скасаваньня польскага калідору ў Гданск. Гэтыя дамаганьні Нямеччыны знаходзяць сабе моцную паддзержку ня толькі ў Амэрыцы ды Англіі, але нават і ў Францыі.

Орган францускай парлямэнтарнай большасьці, радыкальная „Рэспубліка“, абгаварваючы шляхі палітыкі на 1933 год, спадзяецца, што гэты год будзе годам рэвізіі дагавораў, без чаго няма што й думаць аб францускa-нямецкім зьліжэньні і заспакаеньні ў Эўропе. „Нямеччыне — піша, „Рэпюблік“ — трэба прызнаць мандат над бясправўна адарванымі калёніямі, а так-жа трэба разьвязаць справу польскага калідору.“

Гішпанія ў агню новай рэвалюцыі. Манархісты, на супалку з камуністымі, як мы ўжо падавалі, запалілі пажар новай рэвалюцыі ў Гішпаніі. Манархісты намагаюцца вярнуць манархію, а камуністы — завясьці дыктатуру пролетарыяту.Пакульшто маладая Гішпанская рэспубліка змагаецца з аднымі і з другімі.

У Фінляндыі, на востраве **Мак-Эліот**, нодовячы вылецяла ў паветра крэпасьць. Узрыў зьнішчыў яе і 7 казармаў да тла. Ёсьць вялікія ахвяры ў людзях. Агульна падазраюць у гэтай рабоце камуністаў.

Пашпарты і маца ў СССР. Бальшавікі, касуючы ўсё, былі скасаваўшы і пашпарты. Цяпер аднак яны ўжо вярнуліся да пашпартоў і паліцэйскай пашпартнай процэдуры. Пашпарт мусіць цяпер мець кожны, і выдаецца ён толькі на 3 гады і за заплату, а з гэтым пашпартам мусіць усюды мэльдавацца і вымэльдоўвацца.

—У Амэрыцы адна фірма пачала пячы мацу і высылае яе ў СССР. Маца гэта не рытуальная, а спэцыяльная дзеля падкармліваньня галадуючых там людзей, лёгкая для перавозу, ня псуецца, бо блінкі мацы сухія і бяз ніякай прыправы — мука і вада.

Новае наступленьне Японіі на Кітай. У першых днях г. м. японская армія, пры помачы ваенных караблёў і аэраплянаў, узнавіла наступ на кітайскае войска ў Манджурыі. Цяперашняе наступленьне Японіі бярэ кірунак на правінцыю Еголь. Па дарозе забралі японцы партовае места Шангхай—Кван, якое ляжыць над залівам Жоўтага мора. Пасьля гэтага нападу японцаў, кітайскі ўрад зьвярнуўся ў Лігу Народаў, просячы абароны, а японскі ўрад так-жа зьвярнуўся ў Лігу Народаў, каб тая пагадзіла Японію з Кітаем.

Словам, Японія ўжо добра навучылася „эўрапэйскай палітыкі,“ ад якой закруціліся галовы і эўрапэйскім палітыкам.

Дробныя весткі.

Польскі „Стшэлец“—дзяржаўная арганізацыя. Міністр вайны выдаў распараджэньне аб грунтоўнай пераарганізацыі польскай арганізацыі „Стшэльца“.

Гэтым распараджэньнем „Стшэлец“ уводзіцца пад загад адміністрацыі вайсковай. Галоўны камэндант „Стшэльца“ кіраваць гэтай арганізацыяй будзе з міністэрства вайны, як генэрал брыгады.

Звальненьне 460 урадаўцаў варшаўскага магістрату. Магістрат м. Варшавы апынуўся ў цяжкім палажэньні. Няма грошай. Дзеля гэтага ён звальняе 460 урадаўцаў.Армія безработных павялічыцца.

Прот. Рогальскі місіянэрам на Беларусі. Ведамы русафіл прот. Рогальскі, не згадзіўшыся з украінскім праваслаўным епіскапам Полікарпам на Украіне, пераведзены ў Вільню. Цяпер даведваемся, што гэты праваслаўны сьвяшчэньнік-маскаль назначаны віленскім архіепіск. Хвядосам на місіянэра ў віленскай епархіі.

З ВІЛЬНІ.

Судовая справа Б. Тарашкевіча. Прысуд Віленскага Акружнога Суду, які засудзіў б. пасла Б. Тарашкевіча на 8 гадоў катаргі, — заскаржаны. Апэляцыйная скарга ўжо паступіла ў канцэлярыю Суду.

Савецкае „Торгпрэдства“ ў Вільні. Пасьля ратыфікацыі дагавору між Польшчай і Саветамі пачынае пашырацца савецкі гандаль і ў нашым краю. У Вільні закладаецца савецкае „Торгпрэдства“.

Да нас пішуць.

НАШАЯ ПРАЦА.

Мондзіно, Навагрaдзкага пав. Яшчэ за часоў „Грамады“ наша моладзь, ідучы за прыкладам сьвядомых Беларусаў, пачала арганізавацца. Але паліцыя ўмяшалася ў нашы справы і ініцыятарам ледзь удалося выйсьці „суха“. „Апарыўшыся“ тады, наша моладзь аж да апошняга часу як агню баялася арганізацыі. Праўда, сьведамейшыя адзінкі, год ці два таму, стараліся заснаваць гурток «Т-ва Бел. Школы», але якраз тады арыштавалі ўсю Галоўную Управу Т.Б.Ш. і справа кончылася нічым. Урэшце, улетку 1932 г. пачалі некаторыя з нас ізноў думаць, каб як-небудзь сарганізавацца. Паўстала думка ўтварыць „Беларускае Кола вясковай Моладзі“.

Некаторыя, ня ўнікаючы ў істоту рэчы, крычэлі, што гэта «фашызацыя» і „пад чужой вывескай не ўтаргуеш“ (як-бы мы й самі гэтага ня знлі) — Заява пайшла ў старaства. Аднак адміністрацыйная ўлада не згадзілася і на гэта і на тры нашы паданьні ў справе дазволу на спэктакль, адказала адмоўна; а ўрэшце прыслала і афіцыяльную паперку, што нашага «Кола» не зацьвердзіць.

Такім чынам, пасьля дарэмных спробаў, мы ўзноў апынуліся перад мурам, якога галавой не разаб'еш. Але наша моладзь рук не апусьціла. Яшчэ раней адбываліся ў нас спэктаклі і былі выпісаны газэты: „Шлях Моладзі“, „Беларуская Крыніца“ і „Самапомач“, а вось цяпер — на 2-гі дзень Каляд, мы зладзілі „ёлку“, замест меўшагася адбыцца спэктаклю, на які не дасталі ад уладаў дазволу.

Заля „Народнага Дому“ прыгожа прыбрана была зеленьню, партрэтамі і бел-чырвона-белымі сьцягамі, добра асьветленая — выглядала міла і прыгожа. Старыя і малыя, з нашай і суседніх вёсак, ужо гадзін 2 перад пачаткам сабраліся пабачыць традыцыйную „ёлку“. А 6-й гадз. веч. „ёлку“ адчыніў прывітальным словам сябра А. Анішчык, пасьля пачаліся сьпевы і дэклямацыі. Прыгожа адсьпяваныя дзеткамі беларускія песьні і добра сказаныя беларускія вершыкі выклікалі няраз гучныя воплескі нашых дзядзькоў і цётак. Перапоўненую залю ўкрашала прыгожа ўбраная ялінка. Па 2 э гакам гадзінах афіцыяльнае часьці, „сьвяты Цярэшка“ надзяліў прысутных падарункамі і кожнае дзіця з бясплатнай лётэрыі атрымала беларускую кніжку, сшыток ці што інш.

Тады толькі пачаліся скокі пад гукі нашай-жа ўласнай аркестры і трывалі да раніцы. Увесь час панаваў мілы, сямейны настрой; усё адбылося бяз карт, без гарэлкі — ціха і весела. Не ад аднэй цёткі ці дзядзькі можна было пачуць: „Вось дзякуй гэтым маладым: каб не яны, дык мы старыя не пабачылі-б, ды і не пачулі-б нічога. А гэта дык будзе надоўга ў памяці“... Канчаючы, мушу зазначыць, што тутэйшае настаўніцтва, якое паходзіць пераважна з „галілеі“ (ведама-ж, — палякі) ўсімі сіламі стараецца перашкодзіць нашаму маладому і здароваму руху. Яны робяць даносы, якія аб наш сьведамы фронт аднак разьбіваюцца. Насоўваецца на думку беларуская прыказка: пераж ылі мы лета гарачае, перажывём і г...

А. Дратва.

POLSKI KSIONDZ NAZYWAJE PARAFIJAN BIEŁARUSAŬ I LIĆWINOŬ „PASAŽYTAMI“.

Dalokija, Brasłaŭskaha paw. Naša parafija składajecca z biełarusaŭ i lićwinoŭ. Probašč naš —polski ksiondz. Wiadzie jon u nas rabotu polskuju, kab biełarusaŭ i litoŭcaŭ pierarabić na palakoŭ. Dzieła hetaha parafijanie nia lubiać probašča a probašč złujecca na parafijan. Henaje ŭzajemnaje niedalubliwańnie pieraniasłosia ŭžo i na ambonu.

Nadowiačy zdaryŭsia ŭ parafii prykry fakt: ababiŭ niechta hrafskich laśnikoŭ, a prad hetym hetyja laśniki tak-ža ababili i paźwiersku naździekawalisia nad pastyrom wioski Awidawičaŭ. Tady ksiondz byŭ pasiarednikam zhody miž pakryŭdžanym i kryŭdzicielami, a ciapier dyk pačaŭ łajać z ambony za hety tak-ža dziki pastupak adzinak, ciełuju parafiju. Nazwaŭ jon parafijan „Kainami“ i wielmi śmiešna, bo niaŭdała —„pasažytami.“ Cikawaja lohika i pahlady našaha polskaha ksiandza, kali jon nazywaje swaich parafijan, sialan biełarusaŭ i litoŭcaŭ, pasažytami: pawodle jaho paniaćcia musić jon — ksiondz z hrafskimi słuhami heta „lud pracoŭny“, a sialanie žywuć z ichniaj pracy?... Sapraŭdy dziŭnaje paniaćcie ŭ hetaj ksiandzoŭskaj klasyfikacyi. Pry hetym treba skazać, što hetaki klasawy padzieł uwodzić u parafiju, kamu jak kamu, ale ksiandzu dyk nia warta, bo nazoŭ „pasažyty“ da sialan nia prystanie i moža astacca pry asobie takoha ksiandza.

Awidaŭčuk.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.